# МАЛАЯ РАДЗІМА ІВАНА І КАЦЯРЫНЫ











*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Вёска Аброва — адна з самых вялікіх у Івацэвіцкім раёне: тут пражывае болей за тысячу жыхароў.

Сёння гэта — цэнтр сельсавета, а тэрыторыя сельсавета не выходзіць за межы вёскі. Чым і ганарацца вяскоўцы. А яшчэ і тым, што вёска існуе не менш за шэсцьсот гадоў. Маўклівым сведкам даўніны застаўся дуб на старых могілках. На галінах старога дрэва сем буслянак.

Кожную раніцу бусліныя сем'і абуджаюць сваім клёкатам вясковую цішыню. Адну з такіх сонечных раніц Аброва давялося назіраць і мне.



**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

**Больш здымкаў глядзіце на сайце www.zviazda.by**

# Годныя ўмовы працы, быту і заробкі...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Мы, мясцовыя, нездарма кажам: дзе нарадзіўся, там і згадзіўся. У гаспадарцы працуе нямала тутэйшых хлопцаў і дзяўчат. Абзавяліся сем'ямі, хатняй гаспадаркай, гадуюць дзяцей. А самае галоўнае, што ў кожнага ёсць уласнае жыллё, — дадае Жанна Адамаўна.

— У нас, можна сказаць, жыллёвая праблема вырашана цалкам: узведзена каля 70 катэджаў сядзібнага тыпу. Спадзяёмся, што сёлета зноў трапім у Дзяржпраграму аднаўлення і развіцця сяла і плануем за кошт банкаўскіх крэдытаў пабудаваць яшчэ тры катэджы, — дзеліцца планамі **дырэктар ААТ «Лазавічы» Міхаіл АСКЕРКА.** — А гады праз два ў аграгарадок прыйдзе і газ — ужо рыхтуецца праектна-каштарысная дакументацыя. Імкнёмся, каб у нас умовы працы, быту, пражывання былі не горшыя, чым у гарадскіх жыхароў.

Як лічыць дырэктар, у кожным населеным пункце павінны быць бездакорныя дарогі, сацыяльнае абслугоўванне, неабходныя тавары паўсядзённага попыту, якасныя прадукты харчавання і вада, доступ да сучасных інтэрнэт-рэсурсаў. Толькі так можна забяспечыць камфортнае і якаснае пражыванне сельскіх людзей. А гэта ў сваю чаргу дазволіць прыцягнуць і замацаваць кадры на вёсцы, у тым ліку і маладых спецыялістаў.

— Што трэба сучаснаму маладому чалавеку, на вашу думку, Міхаіл Пятровіч? — цікаўлюся ў кіраўніка. — Здавалася б, у аграгарадках ёсць усе неабходнае, але чамусьці многія імкнуцца ў горад.

— Вёску трэба любіць. Без гэтага пачуцця тут не прыжывешся, — лічыць суразмоўнік. — А калі палюбіш зямлю ўсёй душой, то і зусім іншыя адносіны будуць да сельскай гаспадаркі. Падчас сезонных работ даводзіцца практычна ўвесь дзень шчыраваць на палетках, без выхадных. А маладыя хочуць адпачыць. Вядома, па меры магчымасці стараемся даваць моладзі выхадныя і ў пік асноўных работ. Шмат маладых спецыялістаў прыжываюцца ў нас, бо разумеюць, што ў горадзе такога дыхтоўнага жылля за дарма не атрымаеш.

— А як наконт занятасці? Работы ў аграгарадку ўсім хапае? — пацікавілася ў мясцовых жыхароў.

— Не лянуйся, толькі працуй. Калі добры работнік, то і жыць будзеш заможна. Паглядзіце, якія прыгожыя дамы навокал. Некаторыя сем'і маюць па дзве машыны, — прагучала ў адказ.

Сапраўды, у Лазавічах практычна запоўнены штат работнікаў. Хапае механізатараў, паляводаў, спецыялістаў, аператараў машыннага даення. Даяркі маюць па дзесяць выхадных у месяц з улікам падмены і зарабляюць па 800 рублёў.

У аграгарадку вытрыманы ўсе сацыяльныя стандарты. Ёсць два магазіны, сталовая, аддзяленне банка, бібліятэка, клуб, дзіцячы сад, сярэдняя школа. Але вучыцца тут не так шмат дзяцей. Летась было толькі два першакласнікі. Таму бацькі вымушаны іх вазіць у школу суседняга аграгарадка Морач. Ды мясцовыя жыхары лічаць, што закрываць вучэбную ўстанову не варта. Няма будучыні ў населеных пунктах, дзе ліквідуюцца дзіцячыя ўстановы. Такога меркавання прытрымліваецца і Міхаіл Аскерка. Калі малыя растуць у сваім аграгарадку, то больш шанцаў, што яны тут застануцца і пасля школы або вернуцца на малую радзіму пасля заканчэння вышэйшых і сярэдніх навучальных устаноў.



У аграгарадку, як у горадзе.

— У нас створана ўся неабходная інфраструктура, каб людзі маглі жыць годна, — сустракае нас на сваім падворку Ганна Сомава.— Радуе, што ёсць магазіны, дзе набываем прадукты, тавары паўсядзённага попыту. А калі нечага не хапае, то можна зрабіць індывідуальны заказ і ўсё неабходнае прывязуць наступным разам. Рэгулярна да нас прыязджае аўтакрама, якая па просьбе можа спыніцца каля дамоў пажылых людзей. Гэта вельмі зручна і эканоміць час.

Ганна Іванаўна толькі нядаўна пайшла на адпачынак, да гэтага ўзначальвала жывёлагадоўчую ферму, агульны працоўны стаж жанчыны 50 гадоў.

— Вельмі добра, што ў аграгарадку ёсць фельчарска-акушэрскі пункт, — дадае яна. Урач агульнай практыкі заўсёды выслухае, прапіша неабходныя лекі. Тут можна памераць ціск, зрабіць кардыяграму, аналіз крыві, прайсці розныя працэдуры, палячыць зубы. Чым не зручна? У сваю чаргу ў амбулаторыі рэгулярна вядзе прыём і тэрапеўт з раёна.

— І ўсё ж, — звяртаюся да кіраўніка базавай гаспадаркі Міхаіла Аскеркі, — якім вы бачыце свой аграгарадок у будучым? Гарадком-садам, кветкай, сонцам?

— Якім ён будзе праз дзесяцігоддзі цяжка сказаць. Гэта залежыць ад моладзі, якая прыйдзе нам на змену. Але адназначна населены пункт будзе развівацца і прыгажэць, станавіцца больш камфортным для жыцця. Ды для гэтага трэба, на мой погляд, мяняць сістэму ўладкавання аграгарадкоў, мысленне жыхароў. Варта прыцягваць людзей, якія б рыхтавалі сваіх дзяцей, унукаў да працы ў сельскай мясцовасці. І ндрэнна, каб дзяржава выдзяляла крэдыты для будаўніцтва шыкоўнага катэджа, на закупку тэхнікі. У такім выпадку чалавек атрымае магчымасць адкрыць і развіваць сваю справу не толькі ў сельгасвытворчасці, але і ў турызме, іншых відах дзейнасці. І ў наступным пакіне набытае сваім нашчадкам, якія прадоўжаць справу.



Ганна СОМАВА мае 50 гадоў стажу ў жывёлагадоўлі.

Фота Анатоля БАСАВА.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

■ Бяспека на дарозе

# ДЫПЛАМАТЫ ЗА РУЛЁМ

**Роў рухавікоў, на старт, увага... Так пачынаюцца амаль усе гонкі, і, калі бачыш, як аўто эфектна дрыфціць па асфальце, уздымаючы клубы дыму, хочацца паспрабаваць так жа. Але часцей кіроўцы сустракаюцца з іншым экстрэмальным ваджэннем: калі на слізкай дарозе калёсы губляюць счапленне і машыну пачынае заносіць. Прадухіліць аварыю атрымліваецца далёка не заўсёды, бо ў аўташколах усе небяспечныя сітуацыі вывучаюцца толькі ў тэорыі, а на практыцы так лёгка разгубіцца і «злавіць» дрэва.**



Удзельнікі змаглі сябе адчуць і пажарнымі: прадстаўнікі МНС паказалі інструменты, з якімі працуюць на месцах аварый.

У Беларускім клубе аўтамотатурызму ведаюць гэтыя сітуацыі лепш за многіх, бо дапамагаюць у выпадку ДТЗ нашым і замежным грамадзянам. Гэты клуб пры падтрымцы Міністэрства замежных спраў, Мінтранса і МНС арганізаваў спецыяльны выезд для дыпламатаў і іх сем'яў, дзе яны змаглі самі адчуць, як гэта — ездзіць на няўстойлівых колах, успомнілі правілы і прыёмы першай медыцынскай дапамогі і зноў жа звярнулі ўвагу на бяспеку на дарогах. Ініцыяваў мерапрыемства **ганаровы консул Бахрэйна ў Беларусі і старшыня праўлення БКА Рафаэль МУСАЕЎ.**

Спадар Мусаеў расказаў, што аўтаклуб працуе ўжо больш за 20 гадоў у Беларусі. Яны аказваюць дапамогу як членам аб'яднання, так і іншаземцам. Напрыклад, калі ў ДТЗ трапіў грамадзянін іншай краіны, консульствы часта звяртаюцца да іх і арганізацыя дапамагае ў тым ліку перавезці аўто на радзіму гаспадара. «Сёння шмат дыпламатаў уступаюць у члены клуба, — гаворыць Рафаэль Мусаеў, — таму што ва ўсім свеце ёсць аўтамабільныя клубы, якія аказваюць такія паслугі. І, будучы ў сябе на радзіме, дыпламаты прывыкаюць атрымліваць іх».



Сістэма Skidcar, якая прыпадымае колы аўто.

**Міністр замежных спраў Беларусі Уладзімір МАКЕЙ** адзначыў, што бяспека дарожнага руху сёння з'яўляецца надзвычайна важнай праблемай не толькі ў Беларусі. Ён расказаў, што нядаўна на пасяджэнні Генеральнай Асамблеі ААН была прынята рэзалюцыя «Паляпшэнне бяспекі дарожнага руху», сааўтарам якой таксама выступіла і наша краіна. Па сутнасці, да аварыйнай сітуацыі можа прывесці і тэхнічная паломка, і сам кіроўца, які, напрыклад, палічыў, што выпіць сто грам на дарожку не пашкодзіць. Як лічыць кіраўнік знешнепалітычнага ведамства, «у канчатковым выніку ўся праблема заключаецца ў чалавечым фактары, таму трэба зыходзіць з таго, што нам неабходна вучыцца культуры ваджэння». Уладзімір Макей звярнуў увагу на тое, што, паколькі наша краіна транзітная, неабходна, каб яна асацыявалася з узорнымі паводзінамі на дарозе. Гэта імідж Беларусі, і мы ўжо дасягнулі пэўных поспехаў у гэтым кірунку. Напрыклад, як заўважыў міністр, у нас амаль ніхто не пераходзіць дарогу на чырвоны.

Дыпламаты змаглі самі адчуць, як гэта — калі заносіць на дарозе. Трэнажорная сістэма Driftcar уяўляе з сябе красовер на колцах. Літаральна: заднія колы стаяць на спецыяльнай падстаўцы з чатырма меншымі, таму шафёр не можа кіраваць імі. Калі садзішся, пад тваёй уладай толькі пярэднія колы і ўласныя майстэрства і вопыт. Уладзімір Макей заўважыў: «Мы правільна зрабілі, што сёння праводзім гэтую акцыю. Сапраўды, калі ўзнікаюць неардынарныя сітуацыі, трэба ведаць, як паводзіць сябе. Мы дамовіліся з калегамі, якія паказваюць нам сёння правілы кіравання, што абавязкова падумаем, як арганізаваць і для дыпламатаў падобныя курсы і як патрэніравацца правілам экстрэмальнага кіравання».

Можна было сапраўды адчуць, як гэта важна — прышпільвацца: спецыяльная ўстаноўка пераварочвае машыну вакол сябе. Калі вісіш уніз галавой, сапраўды адчуваеш, што супраціўляецца сілам гравітацыі і выратоўвае цябе ад падзення толькі гэты рэмень. Яшчэ падчас акцыі валанцёры Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа прадэманстравалі, як дзейнічаць пры розных траўмах, якія можна атрымаць у ДТЗ, а супрацоўнікі МНС далі патрымаць інструменты, з якімі працуюць на месцах аварый.

**«У канчатковым выніку ўся праблема заключаецца ў чалавечым фактары, таму трэба зыходзіць з таго, што нам неабходна вучыцца культуры ваджэння».**

**Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Германіі ў Беларусі Петэр ДЭТМАР** адзначыў, што розніца ў дарожным руху нашых краін толькі ў тым, што па аўтабане можна ездзіць нашмат хутчэй. З уласнага вопыту дыпламат расказаў, што ў нашай краіне кіроўцы за горадам паводзяць сябе больш дысцыплінавана, але ў межах населеных пунктаў часам непрадказальныя. У Германіі ўсё наадварот. Адзін з галоўных момантаў у горадзе, які адзначыў Петэр Дэтмар, — выкарыстанне мабільных тэлефонаў падчас руху. Гэта вельмі небяспечна, паколькі кіроўца не можа цалкам кантраляваць сітуацыю на дарозе.

**Надзея АНІСОВІЧ**